Славамір АНТАНОВІЧ

# Шлях да трагедыі

**У 1976 годзе былі праведзены XXV з'езд КПСС і XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі. Акрамя дзвюх надзвычай важных падзей, у рэспубліцы здарылася і трагічная — у аўтааварыі загінулі Ф. А. Сурганаў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, і Л. І. Бяда, генерал-лейтэнант авіяцыі. Мінула паўтара дзесятка гадоў, але розныя чуткі аб аварыі ўсё яшчэ жывучыя, сёй-той спрабуе ўвязаць гэту трагічную гісторыю з гібеллю Машэрава. Дык што — версія аб наўмыснай аўтакатастрофе мае падставы!**

**З гэтым трагічным выпадкам звязаны прыезд у Беларусь члена Палітбюро ЦК КП Кубы, другога сакратара ЦК КП Кубы Рауля Кастра.**

15 СНЕЖНЯ 1976 ГОДА, на другі дзень візіту, Р. Кастра прыняў Л. І. Брэжнеў.

У ходзе гутаркі паміж імі былі закрануты пытанні далейшага ўмацавання і развіцця савецка-кубінскага супрацоўніцтва ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і I з'езда Кампартыі Кубы. Р. Кастра перадаў Брэжневу пасланне Фідэля Кастра. Прысутнічалі сакратар ЦК КПСС К. У. Чарненка і член Палітбюро ЦК Кампартыі Кубы, намеснік Старшыні Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба К. Р. Радрыгес.

Зразумела, гэты чарговы візіт адбыўся з нагоды «гістарычнай» падзеі — дня нараджэння Генсека. Р. Кастра ўручыў Л. І. Брэжневу ордэн «Плайя-Хірон».

А 21 снежня, у аўторак, Р. Кастра з жонкай прыбыў поездам у Мінск. БЕЛТА паведамляла, што на пероне чыгуначнага вакзала высокага госця цёпла і сардэчна сустракалі кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. А. Сурганаў, Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў з жонкай, члены і кандыдаты ў члены Бюро ЦК КПБ, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ. Р. Кастра зрабіў паездку на мемарыяльны комплекс «Хатынь» і да Кургана Славы, наведаў Дом-музей I з'езда РСДРП і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Чарговая інфармацыя аб знаходжанні Р. Кастра ў Беларусі з'явілася ў друку праз тры дні. «24 снежня 1976 года (у пятніцу) другі сакратар ЦК Кампартыі Кубы, першы намеснік Старшыні Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба Рауль Кастра і суправаджаючыя яго асобы наведалі Брэсцкую крэпасць-герой...

Таварыш Рауль Кастра пабываў на месцах жорсткіх баёў ля Кобрынскага перадмаставога ўмацавання, на Цэнтральным востраве цытадэлі. Высокі госць агледзеў мемарыяльны комплекс, пазнаёміўся з экспазіцыяй музея, зрабіў запіс у кнізе ганаровых наведвальнікаў».

Больш аб візіце Р. Кастра афіцыяльных звестак у друку не было. А 28 снежня 1976 года ўсесаюзныя, рэспубліканская газета апублікавалі некралог ад Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР, а таксама ад ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў рэспублікі, дзе з жалем паведамлялася, што 26 снежня (у нядзелю) 1976 года на 66-м годзе жыцця ў выніку аўтамабільнай катастрофы трагічна загінуў Фёдар Анісімавіч Сурганаў — член Цэнтральнага Камітэта КПСС, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**На здымку: П. М. Машэраў і Ф. А. Сурганаў (злева) у прэзідыуме рэспубліканскага партыйна-гаспадарчага актыву.**

Ф. А. Сурганаў нарадзіўся ў 1911 годзе ў Віцебскім раёне. Ён — член Бюро ЦК КПБ, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. У 1971 годзе быў выбраны Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, да гэтага — другі сакратар ЦК КПБ.

У гэтым жа нумары «Звязды» быў апублікаваны некралог ад Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР, у якім гаварылася, што ў гэты ж дзень трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе член ЦК КП Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, камандуючы авіяцыяй Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі генерал-лейтэнант авіяцыі Леанід Ігнатавіч Бяда.

Л. І. Бяда нарадзіўся ў 1920 годзе у Кустанайскай вобласці. Прайшоў шлях ад курсанта да генерал-лейтэнанта авіяцыі. Са жніўня 1942 года і да канца Вялікай Айчыннай вайны Л. І. Бяда — на фронце. Лётчык-штурмавік, камандзір эскадрыллі, памочнік камандзіра палка. Ваяваў на Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах, праявіў высокае лётнае майстэрства, тактычную вывучку і бяспрыкладную асабістую мужнасць, зрабіў больш чым 200 баявых вылетаў.

У пасляваенны перыяд Л. І. Бяда камандаваў авіяцыйным палком, дывізіяй, авіяцыяй Беларускай ваеннай акругі.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы